**АПЫТАННЕ** – асноўны від праверкі і ўліку ведаў вучняў, ажыццяўляецца ў форме пытанняў і адказаў.

Па форме апытанне бывае найчасцей вуснае і радзей пісьмовае.

Плануючы апытанне, настаўнік улічвае тры аспекты, якія яно ў сябе ўключае: змястоўны (што апытваецца), матывацыйны (для чаго апытваецца), метадычны (як апытваецца).

Зместам апытання з'яўляюцца як веды, так і ўменні вучняў. Апытанне па літаратуры – дзейсны сродак развіцця мовы школьнікаў і іх мыслення.

Апытанне праводзіцца з мэтаю кантролю, замацавання і абагульнення вывучанага матэрыялу, падрыхтоўкі да ўспрымання новых ведаў, актывізацыі ўсяго навучальнага працэсу. Яно выконвае функцыю самакантролю працы настаўніка. Праз апытанне выяўляецца эфектыўнасць выбранай педагогам методыкі.

Для праверкі ведаў і ўменняў вучняў шляхам апытання настаўнік распрацоўвае сістэму асноўных і дадатковых пытанняў. У школьнай практыцы тэрмін "апытанне" традыцыйна суадносяць з першай часткай урока, скіраванай на выяўленне ведаў, атрыманых вучнямі на папярэднім уроку і пры выкананні дамашняга задання.

Метадысты вылучаюць тры віды апытання: *індывідуальнае, франтальнае, камбінаванае.*

Індывідуальнае апытанне прадугледжвае разгорнуты, лагічна матываваны, доказны адказ вучня на падрыхтаванае спецыяльна для яго пытанне. Такі від праверкі ведаў развівае культуру маналагічнай мовы і спрыяе выяўленню глыбіні разумення вучнямі вывучанага матэрыялу. Разнавіднасцю індывідуальнага апытання могуць быць выразнае чытанне, вусны пераказ, паведамленне пра жыццё і творчасць пісьменніка, характарыстыка літаратурнага працэсу пэўнага часу і інш.

Пры франтальным апытанні, якое звычайна ахоплівае амаль увесь клас, на пытанне настаўніка могуць адказваць некалькі вучняў, дапаўняючы і ўдакладняючы адзін аднаго. У гэтым выпадку адказы школьнікаў больш лаканічныя і не такія грунтоўныя і глыбокія, як пры індывідуальным апытанні.

Вартасць франтальнага апытання ў тым, што яно ўключае ў актыўную працу вялікую колькасць вучняў і дае магчымасць праверыць якасць падрыхтоўкі ўсяго класа.

Пад камбінаваным апытаннем трэба разумець спалучэнне індывідуальнага і франтальнага яго відаў, а таксама вуснай і пісьмовай формаў.

У сучаснай методыцы як від апытання шырокае выкарыстанне набывае тэсціраванне.

Адметнасць урока літаратуры ў тым, што апытанне можа не вылучацца як асобны этап, а арганічна ўваходзіць у вывучэнне новага. Прыярытэтны прынцып развіццёвага навучання прадугледжвае спалучэнне рэпрадуктыўнай і пошукавай працы школьнікаў. Усякая дзейнасць вучня на ўроку ўлічваецца і фіксуецца, г.зн. апытанне праходзіць праз увесь урок. У апошні час у школе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

атрымаў распаўсюджанне так званы пастаянны кантроль за паспяховасцю вучняў – маніторынг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ